**УДК 304.42:130.2(476):821.161.3**

# ПРАБЛЕМА «ЗАХАД – УСХОД» У БЕЛАРУСКАЙ ПУБЛІЦЫСТЫЦЫ І МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XX СТАГОДДЗЯ

***канд. філал. навук, дац. А.М. МЕЛЬНІКАВА***
***(Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны)***

*Разглядаюцца погляды беларускіх публіцыстаў і пісьменнікаў першай трэці XX стагоддзя на праблему памежнага становішча Беларусі, яго ўплыву на гістарычны лёс Беларусі. Асэнсоўваецца роля праблемы «Захад – Усход» у фарміраванні ўяўленняў пра спецыфіку нацыянальнага «Я». Сцвярджаецца, што канцэпцыя памежнага становішча Беларусі закладвалася ў ідэнтыфікацыйны код беларускай літаратуры на пачатку XX стагоддзя і з'яўлялася ключавой на працягу доўгага часу. Памежжа выступае як месца, дзе афармляецца беларуская суб'ектнасць. Асэнсаванне памежнага становішча Беларусі ў публіцыстыцы і мастацкай літаратуры гэтага часу адбывалася ў межах антыкаланіяльнага дыскурсу. Беларускія аўтары разглядаюць розныя геапалітычныя ўстаноўкі адносна Беларусі, асэнсоўваюць механізмы каланізацыі. У першай трэці XX стагоддзя ў літаратуры афармляецца канцэпцыя трагедыйнага лёсу беларускай нацыі, што абумоўлена памежным становішчам краю.*

**Уводзіны.** Ключавой у беларускай культуралогіі, літаратуры з'яўляецца канцэпцыя памежнага становішча Беларусі паміж Захадам і Усходам. Гэта канцэпцыя афармляецца ў пачатку XX стагоддзя: работы В. Ластоўскага А. Луцкевіча, М. Багдановіча, Ул. Жылкі, Я. Лёсіка, І. Канчэўскага, Ул. Самойлы, творы Янкі Купалы, М. Гарэцкага, Кузьмы Чорнага. Усход і Захад успрымаюцца як розныя тыпы цывілізацыі і культуры.

**Асноўная частка.** Пачатак XX стагоддзя – час актыўнага нацыянальнага самаўсведамлення, перыяд нацыянальна-культурнага будаўніцтва, канцэптуалізацыі нацыянальнага. У гэты час афармляецца пэўная мадэль нацыянальнай літаратуры, адбываецца фарміраванне нацыянальнай міфалогіі. Значную ролю ў гэтым працэсе адыгрывала асэнсаванне Беларусі ў сістэме каардынат «Захад – Усход».

Першым, хто на светапоглядным узроўні паспрабаваў вызначыць спецыфіку Беларускага Шляху, быў Ігнат Канчэўскі (псеўданім Ігнат Абдзіраловіч) у трактаце «Адвечным шляхам» (Вільня, 1921): «Беларусь ад X веку і да гэтай пары фактычна з'яўляецца полем змагання двух кірункаў эўрапейскай культуры – заходняга і ўсходняга. Граніца абодвух уплываў, падзяляючы славянства на два станы, праходзіць праз Беларусь, Украіну і хаваецца ў балканскіх краёх» [1, с. 44]. Такім чынам, асноўнымі прыкметамі беларускай ідэнтычнасці, паводле І. Канчэўскага, з'яўляюцца становішча паміж Усходам і Захадам, хістанні паміж гэтымі культурамі, а таксама адначасовае непрыманне іх. І. Канчэўскі лічыць, што беларусы не з'яўляюцца ні народам Усходу, ні народам Заходняй Еўропы. Даследчык прапануе выбудоўваць уласную ідэнтычнасць, шукаць свой шлях. Паказальна, што ў якасці псеўданіма І. Канчэўскі абірае імя галоўнага героя аповесці М. Гарэцкага «Дзве душы» – Ігната Абдзіраловіча, каб падкрэсліць суіснаванне ў беларускай ментальнасці рысаў заходняга і ўсходняга светапогляду.

Аналізуючы работу І. Канчэўскага, Т. Слінка зазначае: «Мяжа, якая зазвычай акрэсьлівае, фармуе нацыю, у дадзеным выпадку стаецца ейнай сутнаснай адзнакай, ейнай ідэнтычнасцю» [2]. Такім чынам, памежжа выступае як месца, дзе афармляецца беларуская суб'ектнасць, што адпавядае антрапасофіі М. Бахціна: памежжа – месца-акт сустрэчы з Іншым.

Уладзімір Самойла (1878–1941), беларускі публіцыст, літаратурны крытык, філосаф у артыкуле «Про старую и новую унию» выказвае аналагічныя меркаванні: «Белорусский мир <…> исконно находится, как известно, материально и духовно между двумя, значительно сильнейшими его во всех отношениях, империалистически устремленными на него мирами – русским и польским. Оба соседа Белоруссии вот уже пять веков с лишком ведут между собой смертельную войну, в первую очередь – за землю и душу белорусского народа, подвергая и ту и другую, как объект и поле борьбы, беспрерывному и систематическому опустошению» [3, с. 160].

Трэба сказаць, што пра памежнае становішча Беларусі пісаў яшчэ А. Міцкевіч у XIX стагоддзі: «Нарманы і ляхі прыходзілі сюды са сваёй уладай, і схіляліся яны то пад скіпетрам рускіх князёў, то пад уладай Польшчы… Тут сутыкалася каталіцкая рэлігія з усходняй царквой, шляхецкая Рэч Паспалітая з сістэмай самаўладства…» [4, с. 12].

Беларусь як поле змагання паміж Расіяй і Польшчай паўстае ў К. Каганца: «Адны з гэтых хіт рых хочуць, каб у нас была Польшча, а другія – каб была Расія, і стараюцца нас так увесці, каб мы ўвекі не патрапілі на сцежку да лепшай долі» («Парада», 1905) [5, с. 68 ].

На пачатку XX стагоддзя пачынаюцца працэсы канструявання беларускай нацыі, нацыянальнага самаўсведамлення. Перад дзеячамі нацыянальна-культурнага адраджэння стаяла задача перш за ўсё

абгрунтаваць уласную суб'ектнасць, уласна беларускі пункт погляду на гісторыю, культуру, мову, сцвердзіць самабытны характар беларускай нацыі. У «Прадмове да «Падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка» (1924) В. Ластоўскі заяўляе: «Мы крывічы, а не Русь Літоўская, Варажская ці Маскоўская, Белая ці Чорная, мы асобны славянскі народ, не правінцыянальная чыясь адмена» [6, с. 366]. Пра самабытнасць беларускай культуры піша М. Багдановіч у «Кароткай гісторыі беларускай пісьменнасці да 16 сталецця»: «Беларускі ж народ, цалкам увайшоўшы ў Літоўскае гасударства, развіваўся, як і раней, на старым корані, вытвараючы такім парадкам культуру, незалежную ад культуры велікарускай і з самага ж пачатку адражняўшуюся ад яе» [7, с. 201].

Асэнсаванне памежнага становішча Беларусі ў публіцыстыцы і мастацкай літаратуры адбываецца ў межах антыкаланіяльнага дыскурсу, дэканструкцыі каланізатара. У сваіх артыкулах В. Ластоўскі пастаянна гаворыць пра розныя геапалітычныя ўстаноўкі ў адносінах да Беларусі: успрыманне нашай краіны ці як Паўночна-Заходняга краю Расіі ці як Усходніх межаў з боку Польшчы. Ен крытыкуе палітыку русіфікацыі і паланізацыі (артыкулы «Беларусь пад Расеяй», «Паленне кніг на Беларусі», «Аб назовах «Крывія» і «Беларусь», «Прамова ў Жэневе», «Унія», «Канкардат»), вывучае механізмы каланізацыі.

Сітуацыю каланізацыі фіксуюць А. Луцкевіч (артыкулы «Справа беларускага шрыфту», «Эвалюцыя краёвае культуры»), Я. Лёсік (артыкул «Родня мова і яе значэнне»), Ул. Жылка («У справе ацэнкі беларускага адраджэння», «Народная адукацыя на Беларусі»).

М. Багдановіч звяртае ўвагу на адмоўныя вынікі паланізацыі і русіфікацыі беларускай шляхты і інтэлігенцыі, гаворыць пра непрыхільнае стаўленне прадстаўнікоў польскай і рускай культур да беларускага адраджэння («Белорусское возрождение», «О гуманизме и неосмотрительности»).

Дзеячы нацыянальна-вызваленчага руху гавораць пра прыналежнасць беларускай культуры да заходнееўрапейскай, а пра Беларусь як пра фарпост Заходняй Еўропы на ўсходзе. М. Багдановіч падкрэслівае заходнееўрапейскі характар беларускай культуры ў часы ВКЛ: «Он (город – *А. М.*) сделал белорусскую культуру более красочной, многогранной, ввёл её в оборот западноевропейской жизни и стал, таким образом, передовым форпостом Западной Европы на востоке» [7, с. 261]. Беларускае адраджэнне бачыцца М. Багдановічу вынікам «агульнаеўрапейскага прагрэсу» («Белорусы», «Белорусское возрождение»).

А. Луцкевіч таксама піша пра прыналежнасць беларускага мастацтва да агульнаеўрапейскага: «Наша сучасная драма ёсць адбіцьцё заходнеэўрапейскае сьвецкае драмы» [8, с. 145].

Істотным фактарам нацыянальнай ідэнтычнасці выступае сістэма рэлігійных поглядаў. В. Ластоўскі ставіць пытанне пра неабходнасць «самаакрэсліцца з рэлігійнай стараны»: «Патрэбна ўтварэнне такой формы хрысціянскай царкоўнай арганізацыі, якая бы, не аглядаючыся ні на ўсход, ні на захад, стаяла на грунце нашых нацыянальных інтарэсаў» [6, с. 414]. Да канфесійнага пытання звяртаецца і М. Багдановіч: «Ёсць паміж нас праваслаўныя, ёсць і каталікі. Але народ з нас адзін, бо ўва ўсіх адна гаворка, адны звычаі, адны песні, адна вопратка, адзін лад жыцця» [7, с. 126].

Пытанню канфесійнага становішча Беларусі былі прысвечаны артыкулы Янкі Купалы «Вера і нацыянальнасць», Антона Луцкевіча «Краёвае становішча». У выступленнях беларускіх публіцыстаў пачатку ХХ стагоддзя наглядаецца выразнае размежаванне паміж «Я» і «Іншы», імкненне ўзняць нацыянальную самапавагу. Канцэпцыя памежнага становішча Беларусі пададзена і ў мастацкіх творах. Яна актыўна распрацоўвалася М. Гарэцкім. Упершыню да названай праблемы пісьменнік звяртаецца ў апавяданні «Лірныя спевы» (1914): «Высака дзяржалі князі Саламярэцкія знамя зямелькі свае <…> не згібалі галавы прад цяжкаю сілай маскоўшчыны, не хіліліся і перад хітраю прычэпкаю – Польшчаю…» [9, с. 109]. У аповесці «Ціхая плынь» (1918) аўтар падкрэслівае: «Прытулілася тое Асмолава пры вялікім некалі шляху з Вялікага княства Літоўскага на Масковію» [10, с. 124]. У драматычным абразку «Жалобная камедыя» маладая настаўніца не змагла адкрыць школу, бо сяляне "польскай веры" хацелі польскую школу, а праваслаўныя – рускую. Паказальна, што героямі драматызаванай аповесці «Антон» з'яўляюцца Беларускі аўтар, Маскоўскі дэмакрат, Польскі публіцыст, што ізноў жа ўказвае на спецыфіку геапалітычнага становішча Беларусі. М. Гарэцкі ў сваіх творах («Дзве душы», «Антон») піша пра адкрытасць беларуса і захаду і ўсходу, пра *дзве душы* беларуса, здольнасць зразумець памкненні і рускага і паляка: «…чаму мне саўсім па духу і зразумела як месіянства польскага народа, так і кіраванне да бога і чуда народа рускага па Дастаеўскаму, і гэтыя стараверы, і сектанты, духаборы і далей, і далей» [10, с. 257]. У першай трэці ХХ стагоддзя выпрацоўваецца меркаванне пра абумоўленасць трагізму нацыянальнай гісторыі памежным становішчам краю. У апавяданні «Роднае карэнне» М. Гарэцкі адзначае: «…шмат костачак маскоўскіх, польскіх, казацкіх палягло "паміж пустак, балот беларускай зямлі…. Шведы, французы знаходзілі сабе тут вечны спакой» [11, с. 63]. Сітуацыя памежжа і яе трагічныя вынікі пададзена ў апавяданні «Літоўскі хутарок».

Пра геапалітычнае становішча Беларусі і яго ўплыў на гістарычны лёс краіны піша В. Ластоўскі ў апавяданні «Троцкі замак», аповесці «Лабірынты»: «Яны, як і мы, жылі і мучыліся на ўзмежжы двух

светаў, дзвюх культур, двух процілеглых сабе светаглядаў, уяўленняў. Яны не маглі прыклеіцца да ўсходу ані прымірыцца з захадам» [6, с. 123].

Знакавым творам беларускай літаратуры з’яўляецца трагікамедыя Янкі Купалы «Тутэйшыя» (1922). Пра актуальнасць і для Янкі Купалы праблемы памежнага становішча Беларусі сведчаць вобразы Заходняга і Усходняга вучоных, крытыка іх поглядаў адносна Беларусі. Вуснамі Янкі Здольніка Янка Купала сцвярджае беларускую самабытнасць, права беларусаў на нацыянальную незалежнасць.

Канцэпцыя памежнага становішча Беларусі (паміж Захадам і Усходам) была прынцыпова важнай і для Кузьмы Чорнага. Так, у сваіх творах пісьменнік неаднойчы ўкажа на памежнае становішча Беларусі: «Шмат тут было навырэзана чалавечых прозвішчаў – і кірыліцаю, і лацінкаю, і прозвішчы гэтыя належалі, відаць, людзям з розных куткоў свету, бо тут быў і «Громаў», і «Пшэвідніцкі», і «Карнейчык», і «Жуанеіль» [12, с. 320], «пад гэтым дахам перавярнулася бездань усялякага народу – каб траха, дык з усёй Еўропы, з усходу і захаду» [12, с. 345].

Тэма «Захад – Усход» пастаянна гучыць на старонках раманаў «Пошукі будучыні», «Млечны шлях», «Вялікі дзень»: «А тут праходзіць шаша, што паміж Масквой і Варшавай?» [13, с. 188], «вялікі шлях з усходу на захад праходзіць каля мястэчка Сумліч» [13, с. 80]. Аднаму са сваіх раманаў пісьменнік нават збіраўся даць назву «Захаду і Усходу». Раман «Ідзі, ідзі» павінен быў называцца «Раскрыжаванне». Беларусь у творах пісьменніка паўстае як месца сутыкнення розных уплываў.

Кузьма Чорны таксама бачыць прычыны трагізму беларускай гісторыі ў памежным становішчы краіны. У раманах ваеннага часу ён піша пра розныя геапалітычныя канцэпцыі ў адносінах да Беларусі. Так, герой рамана «Пошукі будучыні» Люцыян Акаловіч з’яўляецца прадстаўніком тых колаў, якія глядзяць на Беларусь як на частку польскіх земляў (крэсаў усходніх): «Арандуючы фальварак пад Клецкам, мой бацька толькі і думаў, што аб звароце ў свой маёнтачак. А дзеля гэтага ідэя пашырэння Польшчы на ўсход стала яго як бы мэтай у жыцці… А з слова «Беларусь» мы смяяліся. Ніякай Беларусі няма, а ёсць Польшча» [13, с. 129]. Граф Паліводскі быў афіцэрам спачатку рускай арміі, а пасля польскай.

Адным з вызначальных фактараў нацыянальнай ідэнтычнасці, як было адзначана, выступае сістэма рэлігійных поглядаў. У Беларусі пачатку ХХ стагоддзя нацыянальнасць часта вызначалася ў залежнасці ад канфесійнай прыналежнасці: каталікі лічыліся «палякамі», а праваслаўныя – «рускімі», што ізноў жа абумоўлена геапалітычным становішчам краю. Такая сітуацыя неаднойчы апісваецца М. Гарэцкім: бацька ксяндза Цыбулькі (раман «Віленскія камунары»), які агітуе за Польшчу, «беларус – жыў у вёсцы каля старой Вілейкі і нават гаварыць па-польску не ўмеў» [14, с. 278]. Маці Мацея Мышкі з’яўляецца каталічкай, таму лічыць сябе полькай.

Кузьма Чорны з твора ў твор нагадвае пра канфесійнае становішча Беларусі, падзел беларусаў на праваслаўных і каталікоў: «Даўно адзванілі ў царкве – адпраўлялася праваслаўная імша. Ад’енчылі таксама і касцёльныя званы: адпраўлялася імша каталіцкая» [15, с. 308]. І адначасова пісьменнік гаворыць пра палітызаванасць царквы і касцёла, якія працяглы час праводзілі палітыку русіфікацыі і апалячвання адпаведна.

**Заключэнне.** Такім чынам, фарміраванне ўяўленняў пра спецыфіку нацыянальнага «Я» адбывалася ў першай трэці ХХ стагоддзя ў значнай ступені праз асэнсаванне памежнага становішча Беларусі ў сістэме каардынат «Захад – Усход», усведамленне ўласнай ідэнтычнасці – праз супастаўленне з Іншым. Беларускія пісьменнікі разглядаюць розныя геапалітычныя ўстаноўкі адносна Беларусі, асэнсоўваюць механізмы каланізацыі. У гэты час у літаратуры афармляецца канцэпцыя трагедыйнага лёсу беларускай нацыі, што абумоўлена памежным становішчам краю.

ЛІТАРАТУРА


1. Абдзіраловіч, І. Адвечным шляхам / І. Абдзіраловіч // Вобраз – 90: літ.-крытычн. арт. – Мінск : Маст. літ., 1990. – С. 43–85.
2. Слінка, Т. Праблема беларускай ідэнтычнасці ў тэксце Ігната Абдзіраловіча «Адвечным шляхам» [Электронны рэсурс] / Т. Слінка. – Рэжым доступу: http://belcollegium.org. – Дата доступу: 10.05.2015.
3. Бабкоў, І. Генэалёгія беларускай ідэі / І. Бабкоў // ARCHE. – 2005. – № 3. – С. 136–166.
4. Міцкевіч, А. Пра Беларусь і беларускую мову / А. Міцкевіч // Філаматы і філарэты. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1998. – 358 с.
5. Каганец, К. Парада / К. Каганец // Творы. – Мінск : Маст. літ., 1979. – 264 с.
6. Ластоўскі, В. Выбраныя творы / В. Ластоўскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1997 – 512 с.
7. Багдановіч, М. Забыты шлях / М. Багдановіч // Поўны зб. твораў : у 3 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – Т. 2.– 600 с.
8. Луцкевіч, А. Выбраныя творы / А. Луцкевіч – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 456 с.
9. Гарэцкі, М. Творы / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 629 с.

10. Гарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1985. – Т. 2 : Аповесці. Драматычныя абразкі. – 416 с.
11. Гарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1984. – Т. 1 : Апавяданні. – 446 с.
12. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны ; пад рэд. В.В. Барысенка. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 7 : П'есы, нясконичаныя раманы і аповесці. – 584 с.
13. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны ; пад рэд. Ю. Пшыркова. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 6 : Раманы "Пошукі будучыні", "Млечны шлях", "Вялікі дзень", аповесць "Скіп'еўскі лес". – 520 с.
14. Гарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1984. – Т. 3 : На імперыялістычнай вайне; Віленскія камунары. – 399 с.
15. Чорны, К. Збор твораў : у 8 т. / К. Чорны ; пад рэд. Ю. Пшыркова. – Мінск : Маст. літ., 1973. – Т. 4 : Аповесці "Лявон Бушмар", "Вясна", раманы "Ідзі, ідзі", "Бацькаўшчына". – 485 с.

*Паступіў 08.06.2015*

## THE PROBLEM OF «EAST – WEST» IN BELARUSIAN PUBLICISM AND LITERATURE OF THE FIRST THIRD OF THE XX CENTURY

***A. MELNIKAVA***

*The article analyses the views of the Belarusian publicists and writers of the first third of the XX century on the problem of the border location in Belarus, its impact on the historical fate of Belarus. The problem of «East – West» and its role in the formation of ideas about the specifics of the national «I» is analised in this work. The author of the article proves that the concept of the border location of Belarus lays in the identification code of the Belarusian literature in the early XX century and is the key concept for a long time. Borderland is understood as a place where Belarusian subjectivity was formed. The process of understanding the boundary position of Belarus in publicists and literature of this time took place in the framework of anti-colonial discourse. Belarusian authors examine the different geopolitical settings in regard to Belarus, comprehend the mechanisms of colonization. The concept of the tragic destiny of the Belarusian nation is formalized in the first third of the XX century literature, what can be explained with the border position of the region.*